# ЭФЕКТ ПРЫСУТНАСЦІ ў кантэксце містычных асацыяцый

## У Нацыянальнай бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі "Мікалай Яроменка. А святло не згасла..."

Гляджу на вялікі па фармаце партрэт народнага артыста СССР Мікалая Яроменкі. Яго прыгожы, мужны твар прыцягвае погляды ўсіх, хто сабраўся ў адной з камфортных галерэй бібліятэкі. На чорнабелым фота — шмат святла, святло раздражняе цэнтры зрокавага ўспрымання, дзейнічае, як магутны магніт, якому цяжка не падпарадкавацца. Класічная музыка ў "жывым" фартэпіянным выкананні настройвае на ўзнёслыя пачуцці. Лаўлю сябе на адчуванні суму. Таго, што з усмешкай. Светлага. Ён быццам лунае ў камерным зале, дзе па сценах развешаны авангардныя карціны маладых мастакоў. І вельмі ўтульна сядзіцца ў мяккіх крэслах малочнага колеру. Чую, як справа паціху напявае прыма Дзяржаўнага музычнага тэатра Наталля Гайда — ва унісон мелодыі, якая гучыць. Здаецца, Грыг.... І прыемна дазволіць сабе крыху містыкі, думаю: людзі не паміраюць, а проста пераходзяць у іншае вымярэнне, адтуль за намі назіраюць, а то і дапамагаюць, калі нам вельмі патрабуецца дапамога. Зусім нядаўна не адмовіла сабе ў задавальненні паглядзець яшчэ раз меладраму Брэта Сілберлінга пра каханне анёла да зямной жанчыны — "Горад анёлаў". Вось і навеялася.

У гэты вечар сааўтары кнігі майго старэйшага калегі Леаніда Екеля,

**Мікалай Яроменка - старэйшы — адзін з апошніх рамантыкаў 20 стагоддзя. Ён шчыра верыў, што свет можна змяніць да лепшага і што для гэтага проста неабходна здзяйсняць учынкі. Зрэшты, усе яго жыццё — гэта адзін вялікі ўчынак у імя праўды, дабра і прыгажосці**

які сціпла назваў сябе яе ўкладальнікам, — паэты, пісьменнікі, крытыкі і акцёры, а таксама людзі, якія з Яроменкам сябравалі і былі блізкія яго сям'і, сабраліся парадавацца выдадзенай кнізе. З родных — старэйшая сястра Валянціна, з сям'і — жонка, толькі жонка, Галіна Арлова, народная актрыса Беларусі. Адна. Бо і яе знакамітага сына — расійскага кінаакцёра Мікалая Яроменкі-малодшага — праз адзінаццаць месяцаў пасля адыходу бацькі не стала...

У культурным жыцці краіны — выхад кнігі ў адроджанай выдавецтвам "Мастацкая літаратура" серыі ЖЗЛБ — падзея. Кніга ж пра яркую асобу, якая ўвасабляе цэлую эпоху. Яго адыход з жыцця супаў з канцом XX стагоддзя. Гэта здарылася 4 ліпеня 2000 года. У адной з газет у тыя дні прагучала: "XX стагоддзе скончылася: памёр Мікалай Мікалаевіч Яроменка".

Паглыбляюся ў мінулае. Мая памяць сігналізуе: і ў цябе ж таксама ёсць свае ўспаміны пра гэтага прыгожага чалавека.

1989 год. Што ж уразіла мяне тады, кансультанта Саюза тэатральных дзеячаў, у момант першай асабістай сустрэчы з яго кіраўніком? (Яроменка ўзначальваў саюз 15 гадоў).

Увесь ён быў — "занадта"... У добрым сэнсе, вядома. І па адносінах да нешматлікага малодшага жаночага звяна ў службовай іерархіі быў занадта ўважлівы: размаўляў з намі нават без кроплі той фармальнай зацікаўленасці, якая цалкам даравальная для занятага сваёй службай чыноўніка. Мікалай Мікалаевіч валодаў здольнасцю быць неафіцыйным, даступным. І яшчэ што ўзрушвала мяне: ён чуў нас не проста па справе. Ён бачыў у кожнай за пра-




цаўніком — чалавека, які ў дадзены перыяд часу іграе не толькі сваю сацыяльную, а ўжо таму паважаную ролю, але і душэўную. Тую частку нашай чалавечай істоты, якую не падшыеш да асабістай справы, планаў, справаздач. І з прыбіральшчыцай ён быў "на роўных", трымаючыся з добразычлівай спагадлівасцю, якая адрознівае чалавека высокай культуры.

Гартаю старонкі кнігі. Шмат здымкаў... У ролях і ў жыцці... Прыгожыя твары... Жонкі, сына, сяброў-акцёраў... Погляд выхоплівае радкі, якія на вечары агучвае іх аўтар — драматург Аляксей Дудараў:

— Была ў Яроменкі яшчэ адна асаблівасць, здольнасць, нават не здольнасць, а хутчэй талент — любіць. Насуперак усяму. Якія б гутаркі ні вяліся, якія б тэмы і праблемы не закраналіся, размова нязменна заканчвалася "маёй Галкай і маім Колькам"... Мікалай Мікалаевіч Яроменка любіў: калі яго пазнавалі на вуліцы, калі ён навідавоку як у грамадскім, так і ў творчым жыцці, калі яго нагружалі ўсім і ўся, калі яго ўзнагароджвалі, калі выходзіў пад аб'ектыў камеры ў генеральскім мундзіры, калі можна было выпіць з сябрамі і пагутарыць пра ўсякую ўсячыну, калі гасцей прымаць трэба. Ён шмат чаго яшчэ любіў... А вось чаго па-сапраўднаму не любіў, мне сказаць цяжка. Думаю, што глыбіннай, дасканалай і разбуральнай нелюбві ў яго не было наогул.

**Мікалай Яроменка жыў ва унісон з лёсам сваей краіны. Ен прарос у яе сваімі каранямі і ганарыўся тым. У гэтым чалавеку ні на ёту не было падробленага. Маналіт... з трапяткім і далікатным сэрцам. Як ніхто іншы ен умеў радавацца чужым поспехам. Ен улюбляўся у людзей і ў імгненне вока мог разглядзець у іх добрае. Вось хто ўжо сапраўды валодаў талентам чалавечнасці**

Апрыёры ёсць такія харызматычныя, як Яроменка-старэйшы, людзі, адзначаныя пячаткай нейкай адмысловай годнасці і высакароднасці. І мы ахвотна, з радасцю іх ідэалізуем, апранаючы ў "белую вопратку" прыгожых метафар, параўнанняў. А людзі ім сугучныя больш або менш. Яроменка — "больш"...

Змагар за ідэалы, рыцар, чалавек з чыстым сумленнем, чалавек гонару, чалавек будучыні, маналіт з трапяткім і пяшчотным сэрцам, чалавек-свята, бацька, суцэльная натура... Шмат, вельмі шмат такіх слоў у кнізе ... Яны аб'ёмныя, энергетычныя, чапляюць сэрца. І хочацца стаць лепшым, жыць больш чыста, светла, у адпаведнасці з біблейскімі запаведзямі... І адчуваць лёгкі датык свайго анёла.

Прэзентацыя кнігі "Мікалай Яроменка. І святло не згасла..." прайшла паспяхова.

У фармаце вечара памяці пра Артыста і Чалавека, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны і выдатнага грамадскага дзеяча. Вёў праграму заслужаны артыст рэспублікі Віктар Манаеў, які ў свой час удастоіўся гонару бачыць зорны артыстычны час Яроменкі: іграў разам з ім у спектаклі "Касцюмер".

Першае слова Манаеў даў каханай жанчыне Яроменкі — Галіне Арловай.

І калі яна гаварыла, мне (у кантэксце містычных асацыяцый) на імгненне здалося, што муж, яе "Ярома", стаяў побач.

Містыка? Ды не, проста эфект прысутнасці, які генерыруецца памяццю і любоўю.

Валянціна **Ждановіч** ■